# АПТЫМІЗАЦЫЯ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА АСНОВЕ ВЫКАРЫСТАННЯ ІНТЭРАКТЫЎНЫХ МЕТАДАЎ НАВУЧАННЯ

**Рагачова В. У.**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

У сучасным беларускім грамадстве намецілася тэндэнцыя да змены прыярытэтаў і сацыяльных каштоўнасцяў. Так, навукова-тэхнічны прагрэс усё часцей разумеецца як сродак дасягнення такога ўзроўню вытворчасці, які максімальна адказвае задавальненню пастаянна растучых патрабаванняў чалавека і развіццю духоўнага багацця асобы. У сувязі з гэтым адбываюцца змены і ў падрыхтоўцы спецыялістаў, патрабуецца карэнная змена стратэгіі і тактыкі навучання ва установах вышэйшай адукацыі. Сёння галоўнымі характарыстыкамі выпускніка любой адукацыйнай ўстановы павінны стаць яго кампетэнтнасць і мабільнасць. Поле прафесійнай рэалізацыі спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці практыка-арыентавана. З'яўляючыся шматфункцыянальнай сферай дзейнасці, сацыяльна-культурная дзейнасць адной са сваіх мэтаў ставіць арганізацыю рацыянальнага і змястоўнага вольнага часу людзей, задавальненне і развіццё іх культурных патрэбаў, стварэнне ўмоў для самарэалізацыі кожнай асобы, раскрыцця яе здольнасцяў, самаўдасканалення і аматарскай творчасці ў межах вольнага часу.

Таму змена вектару адукацыйнага працэсу з падыходу, заснаванага на ведах, на практыка-арыентаваны падыход да вынікаў адукацыйнага працэсу, з аднаго боку, і ўзрастанне значнасці павышэння эфектыўнасці і якасці сацыяльна-культурнай дзейнасці, з іншага боку, прывяло да пастаноўкі праблемы тэхналогій і метадаў навучання, якімі пазначаная практычная арыентаванасць будзе дасягацца. Першарадную ролю ў дасягненні пастаўленых мэтаў адыгрываюць інтэрактыўныя формы і метады навучання.

Інтэрактыўныя метады («inter» – гэта ўзаемны, «act» – дзейнічаць) – азначаюць ўзаемадзеянне, магчымасць знаходзіцца ў рэжыме гутаркі, дыялогу. У адрозненне ад актыўных метадаў, інтэрактыўныя арыентаваны на больш шырокае ўзаемадзеянне навучэнцаў не толькі з выкладчыкам, але і адзін з адным і на дамінаванне актыўнасці студэнтаў ў працэсе навучання [3]. Зыходзячы з гэтага, можна сказаць, што сутнасць інтэрактыўнага навучання заключаецца ў тым, што навучальны працэс арганізаваны такім чынам, калі практычна ўсе студэнты аказваюцца ўцягнутымі ў працэс пазнання. Сумесная дзейнасць вучняў у працэсе пазнання, засваення вучэбнага матэрыялу азначае, што кожны робіць свой асаблівы індывідуальны ўклад, ідзе абмен ведамі, ідэямі, спосабамі дзейнасці. Прычым, адбываецца гэта ў атмасферы ўзаемнай падтрымкі, што дазваляе не толькі атрымліваць новыя веды, але і развівае саму пазнавальную актыўнасць і навыкі ўзаемадзеяння.

Падрыхтоўка спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Беларускім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў ажыццяўляецца з 2009 года. За гэты час назапашаны значны вопыт па ўкараненні ў працэс навучання цэлага спектру інтэрактыўных метадаў. Актыўна выкарыстоўваюцца майстар-класы, канферэнцыі, дзелавыя і ролевыя гульні, круглыя сталы, дыскусіі, творчыя заданні і інш. Сярод гэтых метадаў заслужанай папулярнасцю карыстаюцца метады аналізу дакладнай сітуацыі (case-study) і трэнінг, без якіх не праводзіцца практычна ні адзін занятак па спецыяльнасці.

Метад аналізу дакладнай сітуацыі (сітуацыйны аналіз, аналіз дакладных сітуацый, case-study) – гэта педагагічная тэхналогія, заснаваная на мадэляванні сітуацыі або выкарыстанні рэальнай сітуацыі ў мэтах аналіза дадзенага выпадку, выяўлення праблем, пошуку альтэрнатыўных рашэнняў і прыняцця аптымальнага вырашэння праблем [2]. Пры гэтым пад сітуацыяй разумеецца адпаведная рэальнасці сукупнасць узаемазвязаных фактараў і з'яў, развважанняў і надзей персанажаў, якая характарызуе пэўны перыяд або падзею і якая патрабуе вырашэння шляхам аналізу і прыняцця рашэння. У педагагічнай практыцы прынята вылучаць наступныя віды сітуацый: *сітуацыя-праблема* ўяўляе сабой апісанне рэальнай праблемнай сітуацыі. Мэта студэнтаў: знайсці рашэнне сітуацыі або прыйсці да высновы аб яго немагчымасці; *сітуацыя-адзнака* апісвае становішча, выхад з якога ўжо знойдзены. Мэта студэнтаў: правесці крытычны аналіз прынятых рашэнняў, даць матываванае заключэнне з нагоды прадстаўленай сітуацыі і яе вырашэння; *сітуацыя-ілюстрацыя* прапануе сітуацыю і тлумачыць прычыны яе ўзнікнення, апісвае працэдуру яе рашэння. Мэта студэнтаў: ацаніць сітуацыю ў цэлым, правесці аналіз яе рашэння, сфармуляваць пытанні, выказаць згоду-нязгоду; *сітуацыя-апярэджанне* апісвае прымяненне ўжо прынятых раней рашэнняў, у сувязі з чым сітуацыя носіць трэніравальны характар, служыць ілюстрацыяй да той ці іншай тэмы. Мэта студэнтаў: прааналізаваць дадзеныя сітуацыі, знойдзеныя рашэнні, выкарыстоўваючы пры гэтым набытыя тэарэтычныя веды [1].

Важна памятаць, што адметнай асаблівасцю метада case-study з'яўляецца стварэнне праблемнай сітуацыі на аснове фактаў з рэальнага жыцця. Менавіта сітуацыі, узятыя з практыкі дзейнасці спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы, даюць магчымасць студэнтам атрымаць не толькі тэарэтычныя веды ў галіне прадмета, але і навыкі прафесійнай дзейнасці.

Як было адзначана вышэй, дадзены метад ужываецца ў выкладанні розных прадметаў спецыяльнасці. Што тычыцца нашага вопыту, то метад аналіза канкрэтных сітуацый на працягу апошніх трох гадоў актыўна выкарыстоўваецца намі ў выкладанні курса «Узроставыя (дыферэнцыраваныя) тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці», што дазваляе студэнтам больш дэталёва азнаёміцца са спецыфікай арганізацыі вольнага часу розных груп насельніцтва. У межах дадзенага прадмета тэхналогія працы з кейсам ўключае рэалізацыю наступных этапаў:

1) самастойная праца навучэнцаў (як правіла, індывідуальная) з матэрыяламі кейса. На гэтым этапе студэнтам неабходна вызначыць праблему, сфармуляваць прапановы па яе вырашэнні і даць пералік рэкамендуемых

дзеянняў спецыяліста;

2) другі этап прадугледжвае працу ў малых групах (па 3-5 чалавек). Асноўная задача – ўзгадненне бачання асноўнай праблемы і яе магчымых рашэнняў у рамках дзейнасці спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці;

3) трэці этап – гэта прэзентацыя і экспертыза вынікаў работы малых груп на агульнай дыскусіі (у рамках вучэбнай групы).

У цэлым, аналіз канкрэтных сітуацый (case-study) як метад навучання спрыяе фарміраванню ў студэнтаў здольнасці прымаць рашэнні спачатку ў аналагічных, а потым і ў нестандартных канкрэтных сацыяльна-культурных сітуацыях. Вучэбныя сітуацыі павінны быць арыентаваны на праблемы, тыповыя для сітуацый рэальнай сацыяльна-культурнай працы. Больш за тое, гэты метад могуць быць выкарыстаны ў аўдыторнай працы, пазааўдыторнай працы і непасрэдна ў практыцы сацыяльна-культурнай дзейнасці, арыентаванай на дзейнаснае рашэнне канкрэтных актуальных сацыяльных праблем.

У адукацыйным асяроддзі пад трэнінгам прынята разумець інтэрактыўную форму навучання, мэтай якой з'яўляецца фарміраванне адсутнічаючых навыкаў і ўменняў. Сёння трэнінгі складаюцца з комплексу разнастайных практыкаванняў і гульняў. Яны досыць разнастайныя па сваім мэтавым прызначэнні (ад навучальных і развіваючых да псіхакарэкцыйных і псіхатэрапеўтычных), зместу, формам (трэнінгі, семінары-трэнінгі, трэнінгі-марафоны і інш.) і тэхнікам правядзення.

У якасці асноўных задач выкарыстання трэнінгу ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці можна вылучыць наступныя: развіццё ў студэнтаў здольнасці эфектыўна ўзаемадзейнічаць з рознымі групамі насельніцтва; фарміраванне актыўнай сацыяльнай пазіцыі будучых работнікаў культуры; развіццё ў іх здольнасці рабіць значныя пазітыўныя змены ў сваім жыцці і жыцці навакольных людзей; фарміраванне новых прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў.

Выкарыстанне трэнінгу ў навучальным працэсе пры падрыхтоўцы спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці таксама абумоўлена наступнымі яго адметнымі асаблівасцямі. Па-першае, у час трэнінгу група аказвае ўздзеянне на кожнага ўдзельніка працэсу ў трох плоскасцях: пазнавальнай – удзельнік групы ўсведамляе, як яго звыклыя паводзіны і спосабы адносін дазваляюць вырашыць праблему, асэнсоўвае прычыны сваіх паводзінаў і разумее, як у далейшым больш эфектыўна весці сябе ў падобных сітуацыях, якія складваюцца як у прафесійнай, так і асабістай сферах; эмацыйнай – удзельнік трэнінгу, падтрыманы іншымі членамі групы, ўсведамляе свае псіхалагічныя ахоўныя механізмы, карэктуе адносіны з іншымі, змяняе эмацыйнае стаўленне да сябе, і, як вынік, павялічваецца яго самапавага, стабілізуецца самаацэнка, што дазваляе яму стаць кваліфікаваным спецыялістам; паводніцкай – удзельнік групы выпрацоўвае адэкватныя той ці іншай сітуацыі, спосабы паводзін у бяспечнай абстаноўцы, а не ў рэальным жыцці з яго пагрозамі, рызыкай, трывогай пра непрыемныя наступствы ў выпадку няправільнага рашэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-другое, трэнінг як форма групавой працы дазваляе выкарыстоўваць самыя разнастайныя інтэрактыўныя метады, сярод якіх дыскусійныя метады (дыскусія, метад кейсаў і інш.), гульнявыя метады (імітацыйныя, дзелавыя, ролевыя гульні), мазгавы штурм і інш.

Выкарыстанне трэнінгаў эфектыўна на ўсіх этапах навучання, аднак, рэальны і адчувальны эфект бачны ў засваенні дысцыпліны "Методыка выкладання спецдысцыплін". Спецыфіка падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці ў БДУКМ заключаецца яшчэ і ў тым, што яны паралельна атрымліваюць магчымасць працаваць выкладчыкамі. Таму магчымасць прапрацоўкі розных педагагічных сітуацый у звыклай для студэнтаў абстаноўцы робіць трэнінг незаменным метадам у падрыхтоўцы спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Такім чынам, у параўнанні з традыцыйнымі формамі вядзення заняткаў, у інтэрактыўным навучанні змяняецца ўзаемадзеянне выкладчыка і студэнта: актыўнасць педагога саступае месца актыўнасці студэнтаў, а задачай педагога становіцца стварэнне ўмоў для іх ініцыятывы. Педагог выконвае функцыю памочніка ў працы, аднаго з крыніц інфармацыі. Інтэрактыўнае навучанне забяспечвае паразуменне, узаемадзеянне, узаемазапазычанні. Інтэрактыўныя методыкі спрыяюць лепшаму засваенню лекцыйнага матэрыяла і, што асабліва важна, фарміруюць думкі, адносіны, навыкі паводзін.


1. *Панфилова, А. П.* Инновационные педагогические технологии : Активное обучение : учеб. пособ. / А. П. Панфилова. – М. : Издат. центр «Академия», 2009. – 192 с.

2. *Реутова, Е. А.* Применение активных и интерактивных методов обучения в образовательном процессе вуза (методические рекомендации для преподавателей Новосибирского ГАУ) / Е.А. Реутова. – Новосибирск: Изд-во НГАУ, 2012. – 58 с.

3. *Хаценко, Т. Г.* Интерактивные методы обучения в образовательном процессе вуза (методические рекомендации для преподавателей Ульяновской ГСХА) / Т.Г. Хащенко, Е.В. Макарова. – Ульяновск: УГСХА, 2011. – 46 с.


## ЭТАПЫ РЕЖИССЕРСКО-ПОСТАНОВОЧНОЙ РАБОТЫ В ПРОЦЕССЕ ПОДГОТОВКИ ТЕАТРАЛИЗОВАННОГО ПРЕДСТАВЛЕНИЯ


**Савина В. Ф.**

*кандидат педагогических наук, доцент кафедры педагогики социокультурной деятельности*
*УО «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*
*(Республика Беларусь, г. Минск)*


Основу для режиссуры культурно-досуговых программ и театрализованных представлений составляет разработанная К.С. Станиславским и его последователями система воспитания актера (исполнителя) и режиссера, его учение о сверхзадаче и сквозном действии, его этические, педагогические и художественные принципы, поэтому овладение основами системы является первостепенной задачей, обязательным условием

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ